БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 808.26-56

БОНДАЛ ІРЫНА ВАСІЛЕЎНА

# КАНСТРУКЦЫІ З АТРЫБУТЫЎНЫМІ АДНОСІНАМІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ

(Структурна-семантычная характарыстыка)

10.02.02 - беларуская мова

А Ў Т А Р Э Ф Е Р А Т

дысертацыі на атрыманне вучонай
ступені кандыдата філалагічных
навук

МІНСК - 1995

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце

Навуковы кіраўнік -- доктар філалагічных навук,
прафесар М.С.Яўневіч

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук,
прафесар А.І.Наркевіч

кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Т.П.Бандарэнка

Апаніруючая арганізацыя -- Беларускі дзяржаўны універсітэт

Абарона адбудзецца "27" верасня 1995 года ў 14 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 113.16.04 у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце ( г.Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482 ).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Педагагічнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "25" жніўня 1995 года.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый — кандыдат педагагічных навук, дацэнт М.Г.Яленскі

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

На сучасным этапе развіцця беларускага мовазнаўства актывізавалася ўвага навукоўцаў да сінтаксічнай праблематыкі, значна ўзрасла цікавасць да семантыкі моўных знакаў, што дазваляе разглядаць адзінкі сінтаксісу не толькі ў структурным плане. Адно з найбольш актуальных пытанняў мовазнаўства – суадносіны паміж сінтаксісам і семантыкай, праблема семантычнага ў сінтаксісе. "Семантычны сінтаксіс" вызначае характэрную рысу даследаванняў апошніх дзесяцігоддзяў, іх агульны напрамак.

У працах беларускіх вучоных выразна намецілася тэндэнцыя па-новаму вызначаць прыроду словазлучэння як сінтаксічнай адзінкі. Вывучэнне розных тыпаў словазлучэння, як і вызначэнне заканамернасцей іх гістарычнага развіцця, "спрыяе лепшаму разуменню структурна-семантычных асаблівасцей мовы, яе нацыянальнай спецыфікі" (Л.П.Падгайскі). Сведчанне гэтаму – манаграфіі А.І.Наркевіча, А.Я.Міхневіча, М.С.Яўневіча, Т.П.Бандарэнкі.

Актуальнасць тэмы даследавання. У навуковай літаратуры ўжо знайшлі апісанне сродкі выражэння часавых, прасторавых, мэтавых, прычынных і іншых відаў сінтаксічных адносін, аднак катэгорыя атрыбутыўнасці да гэтага часу не знайшла асвятлення ў беларускім мовазнаўстве. Вырашэнню некаторых прыватных аспектаў праблемы спрыялі асобныя даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў. Так, выяўлены арсенал сродкаў выражэння азначэння – аднаго з кампанентаў атрыбутыўных канструкцый (А.І.Наркевіч), прааналізаваны атрыбутыўныя адзінкі з боку іх палявой структуры і іх міжмоўны эквівалент у практыцы перакладу (М.І.Канюшкевіч). Але і сёння ў беларускім мовазнаўстве не вызначана сутнасць атрыбутыўных адносін, не акрэслены крытэрыі іх выдзялення, межы пашыранасці ў мове, няпоўна выяўлены значэнні, выражаныя рознымі мадэлямі атрыбутыўных канструкцый (АК).

У граматыках і школьных падручніках, дапаможніках для ВНУ традыцыйна асноўная ўвага надаецца залежнаму кампаненту АК,па-за ўвагай застаецца семантыка галоўнага слова, спалучальнасць слоў – сінтаксічная валентнасць.

Існуючы ў свядомасці чалавека, атрыбут-азначэнне мае пэўную сістэму значэнняў, якія ў кожнай мове выражаюцца рознымі сродкамі. Катэгарыяльнае значэнне атрыбутыўнасці заключаецца ў прымет-

ніку – часціне мовы, у якой моўнае выражэнне спалучаецца з адпаведнай функцыяй і лексіка-граматычныя прыметы могуць існаваць у адрыве ад паяснёнага слова. Знакавы характар прыметнікаў як моўных выразнікаў катэгорыі атрыбутыўнасці вынікае з разумення анамасіялагічнага працэсу разумовай аперацыі, спраецыраванай на выяўленне адпаведных уласцівасцей, характэрных якому-небудзь прадмету, з'яве аб'ектыўнай рэчаіснасці з мэтай больш глыбокага пранікнення ў іх сутнасць і ўзаемасувязь.

Абмежаванне атрыбутыўнасці толькі прыметнікам, на нашу думку, звужае рамкі гэтай катэгорыі, бо паняцце атрыбута ў мове не менш шырокае, чым у логіцы. У якасці атрыбута могуць выступаць беспрыназоўнікавыя і прыназоўнікавыя склонавыя формы – лексіка-граматычныя прыметы пры такім выражэнні не існуюць без паяснёнага слова.

Атрыбутыўныя адносіны разглядаюцца ў рамках словазлучэння і складанага сказа, дзе атрыбутам заканамерна можна лічыць дадзеную азначальную частку.

Нацыянальная спецыфіка беларускай мовы выяўляецца ў АК з прыметнікам у ролі залежнага кампанента. Для найбольш поўнага асвятлення сістэмы атрыбутыўных значэнняў лічым мэтазгодным разглядаць беспрыназоўнікавыя словазлучэнні ў адзінстве з прыназоўнікавымі канструкцыямі, якія могуць ужывацца як функцыянальна раўназначныя з імі і ўтвараць сінанімічныя рады (лясная дарога – дарога лесам – дарога праз лес; дзіцячая кніжка – кніжка дзецям – кніжка для дзяцей). Атрыбутыўныя адносіны тут рэалізаваны наступнымі мадэлямі: "прым.+ наз.", "наз.$_I$+ наз.$_2$ Т.", "наз.$_I$+ прыназ.+ наз.$_2$ В.". Абазначаючы прымету прадмета, яго характарыстыку, уласцівасць, залежны кампанент выконвае, як правіла, функцыю азначэння. Пытанне аб сінтаксічным статусе кампанентаў, якія маюць атрыбутыўную семантыку, застаецца дыскусійным. Адсутнасць выразных крытэрыяў вызначэння атрыбутыўных адносін стварае пэўныя цяжкасці пры адмежаванні гэтага віду адносін ад іншых. Аналіз АК на ўзроўні мадэляў дазваляе даць найбольш поўнае апісанне адзінкі на ўсіх узроўнях: марфалагічным (у складзе АК рэалізуюцца патэнцыяльныя магчымасці розных часцін мовы), сінтаксічным (структура АК), лексіка-семантычным (лексічная напаўняльнасць, семантыка, валентнасць), стылістычным (функцыянаванне адзінкі, яе сінаніміка). Даследуючы АК, зыходзім з суадносін формы і зместу. Пад зместам разумеем тыпавыя значэнні канструкцыі або сэнсавыя адносіны паміж

часткамі, з якіх яна складаецца, а пад формай – тыя сінтаксічныя сродкі, з дапамогай якіх гэта значэнне выражаецца.

Актуальнасць абранай тэмы тлумачыцца яшчэ і тым, што АК сярод іншых канструкцый найбольш пашыраныя ў мове. На прадуктыўнасць АК у сучаснай беларускай літаратурнай мове ўплывае структурная разнастайнасць, уласцівая АК, сэнсавыя адценні, тонкая дыферэнцыяцыя адценняў пры агульным значэнні і як вынік – шырокі дыяпазон ужывання ў беларускай мове.

Аб'ект даследавання – АК, па якіх адносім прыназоўнікавыя і беспрыназоўнікавыя словазлучэнні, а таксама – складаназалежныя сказы з даданай азначальнай часткай.

У сувязі з тым, што канструкцыі з атрыбутыўнымі адносінамі могуць быць аб'яднаны сувязямі семантычнага характару, агульнымі тэндэнцыямі развіцця функцыі прыназоўніка, пашырэннем межаў атрыбутыўнасці, даследаванне праводзіцца ў двух напрамках:

1) па шляху адмежавання атрыбутыўных адносін ад іншых відаў сінтаксічных адносін, блізкіх да іх, – выяўлення іх дыферэнцыяльных прымет;

2) у плане падрабязнай характарыстыкі значэнняў, уласцівых атрыбутыўным словазлучэнням, апісання іх сінанімічнасці і функцыянавання ў розных стылях мовы.

Мэта даследавання – даць найбольш поўнае структурна-семантычнае апісанне сістэмы атрыбутыўных словазлучэнняў, якая рэалізуецца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове праз субстантыўныя і уласна атрыбутыўныя, прыназоўнікавыя і беспрыназоўнікавыя канструкцыі ў простым і складаным сказе. У адпаведнасці з вызначанай мэтай у даследаванні пастаўлены наступныя задачы:

1) выявіць лінгвістычную сутнасць катэгорыі атрыбутыўнасці;

2) вызначыць найбольш характэрныя граматычныя і лексіка-семантычныя крытэрыі атрыбутыўнасці, магчымыя межы і аб'ём АК;

3) прааналізаваць структурныя кампаненты канструкцыі;

4) даць апісанне структурна-семантычных груп АК, выявіць іх семантычныя адценні;

5) паказаць сінанімічныя сродкі выражэння атрыбутыўнасці і раскрыць іх ролю ў тэкстах як важнага стылістычнага сродку;

6) прасачыць функцыянаванне АК у тэкстах розных стыляў, пацвердзіўшы тым самым гіпотэзу, што АК – спецыфічны сродак дыферэнцыяцыі моўных стыляў;

7) вызначыць канструкцыі, у якіх найбольш поўна выяўляецца нацыянальная спецыфіка беларускай мовы.

Для дасягнення пастаўленай мэты і вырашэння канкрэтных задач выкарыстаны метад структурна-семантычнага аналізу словазлучэння (пры характарыстыцы функцыянальных асаблівасцей атрыбутаў, абавязковых і факультатыўных); метад лінгвістычнага апісання моўных фактаў з выкарыстаннем кампанентнага аналізу; даследаванне таксама вялося шляхам комплекснага выкарыстання колькасна-статыстычнага і трансфармацыйнага метадаў.

Матэрыял даследавання. У дысертацыі аналізуюцца выяўленыя метадам суцэльнай выбаркі моўныя факты з твораў мастацкай літаратуры (Я.Колас, І.Мележ, В.Быкаў, Я.Брыль, І.Пташнікаў, А.Жук, В.Карамазаў, У.Караткевіч, Р.Барадулін, Г.Бураўкін, Л.Дайнека, Я.Сіпакоў і іншыя), газетнай і часопіснай публіцыстыкі ("Звязда", "Наша слова", "ЛіМ", "Полымя", "Маладосць", "Спадчына"), навуковых тэкстаў, у якіх ужываюцца разнастайныя АК, выражаныя марфалагізаванымі і немарфалагізаванымі часцінамі мовы ў межах простага і складанага сказа. Усяго прааналізавана каля 5000 АК.

Навуковая навізна. Упершыню ў беларускім моваэнаўстве зроблена спроба апісаць лінгвістычны характар атрыбутыўных адносін, акрэсліць іх месца ў сістэме сінтаксічных адносін, вызначыць суадносіны сінанімічных АК, паказаць іх стылістычную ролю. Апісанне і аналіз АК з іх сінанімічнымі эквівалентамі праводзіцца ў рамках словазлучэння і складанага сказа. Статыстычны аналіз дае падставу разглядаць АК як спецыфічны сродак дыферэнцыяцыі моўных стыляў.

Практычнае і тэарэтычнае значэнне праведзенага даследавання. Вырашэнне праблемы дыферэнцыяцыі атрыбутыўных адносін, вылучэнне найбольш тыповых АК, у якіх праяўляецца нацыянальная спецыфіка беларускай мовы, непасрэдна звязана з устанаўленнем правіл і прыёмаў размежавання гэтых адносін у практыцы выкладання беларускай мовы ў школах і ВНУ рэспублікі. Матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для філолагаў, а таксама для асобнага спецкурса, бо магчыма разглядаць атрыбутыўныя адносіны комплексна, уключаючы пэўныя тэмы з раздзелаў "Лексіка", "Марфалогія", "Сінтаксіс". Выдзяленне тыпаў АК дапаможа глыбей зразумець сінтаксічную катэгорыю азначэння.

На абарону выносяцца наступныя палажэнні:

1. Для выражэння атрыбутыўных адносін у сучаснай беларускай літаратурнай мове ёсць пэўны арсенал беспрыназоўнікавых словазлучэнняў, прыназоўнікава-склонавых канструкцый, якія ўтвараюць стройную сістэму. Наяўнасць у мове вялікай колькасці разнастайных канст-

рукцыі абумоўлена тонкімі сэнсавымі адценнямі, рознай лексічнай напаўняльнасцю, пэўнай сферай выкарыстання.

2. Атрыбутыўныя адносіны вызначаюцца не толькі ў межах простага, але і ў межах складаназалежнага сказа, дзе носьбіт атрыбутыўнага значэння – паяснёны назоўнік у галоўнай частцы, атрыбут – даданая азначальная частка, сродак граматычнай сувязі – злучнік або злучальнае слова.

3. Нацыянальную спецыфіку беларускай мовы найбольш поўна перадаюць словазлучэнні з прыметнікам у ролі залежнага кампанента, у той жа час шырокі дыяпазон ужывання і багацце семантычных адценняў маюць прыназоўнікавыя канструкцыі.

4. Сінанімічным канструкцыям, блізкім па значэнні і розным па структуры, уласціва аднолькавая або блізкая лексічная напаўняльнасць, але не характэрна аднолькавая прадуктыўнасць і сфера выкарыстання.

5. Магчымасць ужывання кожнай канструкцыі абумоўлена лексічнымі фактарамі: прыназоўнікава-склонавыя формы АК набываюць часавае прасторавае або якаснае адценне, калі паяснёнае слова адносіцца д. назоўнікаў пэўнай лексіка-семантычнай групы.

6. Розныя мадэлі АК, іх колькасны склад могуць разглядацца як спецыфічны сродак дыферэнцыяцыі функцыянальных стыляў мовы (як адзінка, характэрная для пэўнага стылю, але не ў якасці стылеўтваральнага сродку).

7. Сінанімічная сувязь паміж асобнымі АК перадае тэндэнцыю мовы да найбольш дакладнага выражэння думкі, стварэння стылістычнай разнастайнасці.

Асабісты ўклад аўтара ў даследаванне заключаецца ў падборы, аналізе і сістэматызацыі моўных фактаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, што дало магчымасць аб'ектыўна і доказна раскрыць сутнасць атрыбутыўных адносін, даць поўную іх характарыстыку.

Апрабацыя вынікаў дысертацыі праводзілася ў працэсе абмеркавання асобных палажэнняў даследавання на навуковай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага саставу Мінскага педагагічнага інстытута (кафедра беларускага мовазнаўства, 19 лютага 1993 г.); на навукова-практычнай канферэнцыі маладых вучоных, прысвечанай пытанням удасканалення прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў сучаснай сістэме адукацыі (Мінскі педагагічны інстытут, 20-21 красавіка 1993 г.); на сесіі прафесарска-выкладчыцкага саставу Віцебскага педагагічнага інстытута (3 лютага 1994 г.); на III міжнароднай канферэнцыі "Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і

літаратуразнаўства" (Віцебскі педагагічны інстытут, 5-7 снежня 1994 г.).

Асноўныя вынікі даследавання апублікаваны ў трох навуковых артыкулах. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў і спіса выкарыстанай літаратуры. Аб'ём дысертацыі складае 110 старонак, з іх 7 старонак – спіс выкарыстанай літаратуры.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першай главе "Характарыстыка атрыбутыўных адносін" разглядаецца структурна-семантычная арганізацыя словазлучэння, аналізуюцца граматычныя асаблівасці АК, вызначаюцца іх дыферэнцыяльныя прыметы.

Словазлучэнне разглядаецца з наступных пазіцый: 1) унутры сінтаксічнай сістэмы, з улікам фактараў, што вызначаюць яе; 2) ва ўзаемадзеянні з іншай сістэмай граматыкі – марфалогіяй; 3) як адзінка звязнай мовы. Падставай для такога падыходу паслужыла тое, што ў сінтаксісе вывучаюцца сінтаксічныя адзінкі з усім комплексам такіх прымет, як функцыі, значэнне, спосабы спалучэння.

Спалучальнасць слоў паказана на двух узроўнях: лексічным і семантычным. На лексічным узроўні спалучальнасць характарызуецца выбарам лексем, параўнаем: чытаць лекцыю, але рабіць даклад; аказаць паслугу, увагу, але праявіць клопат, інтарэс. На семантычным узроўні спалучальнасць слоў вызначаецца семантычным дапасаваннем; кампаненты спалучэння не павінны мець супрацьлеглых сем, напрыклад, дзеяслоў або прыметнік, якія абазначаюць дзеянне, уласцівасць жывой істоты, спалучаюцца з адушаўлёнымі назоўнікамі (птушкі спяваюць, хворы чалавек, дзіця ўсміхаецца), у іншым выпадку пераасэнсоўваецца адзін з кампанентаў (лес спявае, хворае сумленне, сонца ўсміхаецца). Спалучальнасць у тэксце патрабуе стылістычнага дапасавання слова з тэкстам, у адваротным выпадку адбываецца стылістычная транспазіцыя.

Спалучальнасць на сінтаксічным узроўні характарызуецца як валентнасць. Вывучэнне словазлучэння абапіраецца на вывучэнне валентнасці часцін мовы – адзін з уласна сінтаксічных аспектаў словазлучэння. У працы акрэсліваецца паняцце валентнасці, паказваецца разуменне гэтага тэрміна ў рускай лінгвістыцы (С.Д.Кацнельсон) у адрозненне ад заходнееўрапейскага мовазнаўства (Л.Тэньер).

Пры аналізе словазлучэнняў улічваюцца сінтаксічныя адзінкі і уласцівасці слоў, што яе складаюць, бо сінтаксічная семантыка акумулюе лексічную і граматычную семантыку: ажыццяўляецца яна кампанентамі словазлучэння ў рамках бінарнасці. Слова з яго лексічным і граматычным патэнцыялам атрымлівае сінтаксічную кваліфікацыю кампанента.

Атрыбутыўныя адносіны паводле іх інфармацыйнасці ўключаюць наступныя прыватныя значэнні: якасную прымету (вялікі дом, цагляны дом на тры паверхі, кніга без вокладкі, трохгадовая дзяўчынка, цёплы клімат, стол з дубу); колькасную прымету (другі том, чатыры кнігі); пасіўную прымету (машына брата, мой дом, ласіны след, загад рэктара). Названыя значэнні з'яўляюцца цэнтральнымі, рэгулярнымі значэннямі атрыбутыўных адносін.

Акрамя спецыфічных значэнняў разглядаюцца і іншыя. Кожная група сінтаксічных адносін мае перыферыйныя, неспецыфічныя для гэтых адносін значэнні. У сферы атрыбутыўных адносін назіраюцца значэнні: лакальныя (дзверы на балкон, пуцёўка ў санаторый, горад каля мора), тэмпаральныя (пуцёўка на месяц, учарашні дзень, адпачынак на працягу тыдня), мэтавыя (чарга за газетай, барацьба за ўладу, змаганне за свабоду), прычынныя (пропуск з-за хваробы, бойка з-за мячыка, спазненне з прычыны аварыі). У лінгвістычнай літаратуры зроблена спроба разгледзіць такія значэнні як функцыянальную транспазіцыю ў сферы сінтаксічных адносін (А.В.Бандарка).

Выбар сродкаў для выражэння атрыбутыўных адносін абумоўлены некалькімі прынцыпамі, сярод якіх вызначаюцца тыя, што маюць найбольш агульны і заканамерны характар. З аднаго боку выбар таго ці іншага азначэння залежыць ад "камунікатыўнай сілы" носьбіта мовы, ад таго, наколькі канкрэтны носьбіт валодае выразнымі магчымасцямі мовы. Найбольш поўна "камунікатыўная сіла" праяўляецца ў мове мастацкай літаратуры, дзе індывідуальнасць аўтара, яго манера выпрацоўваць адбіваецца найбольш поўна і паслядоўна, а выбар моўных сродкаў носіць актыўны, творчы характар. З другога боку, выбар сродкаў абумоўлены, можа нават абмежаваны, структурай і формай выказвання.

<u>Другая</u> <u>глава</u> "Сродкі выражэння атрыбутыўных адносін" прысвечана аналізу структурна-семантычных груп АК; у ёй на ўзроўні мадэляў разглядаюцца сродкі выражэння атрыбутыўных адносін у простым і складаным сказе, вызначаецца прадуктыўнасць, спецыфіка, семантычныя адценні канструкцый пэўных мадэляў.

Атрыбутыўныя адносіны ў сучаснай беларускай літаратурнай мове вылучаюцца не толькі ў межах простага, але і ў межах складана-

га сказа. Наглядна выражэнне атрыбутыўных адносін у межах простага і складанага сказа можна паказаць схемай:

АТРЫБУТЫЎНЫЯ АДНОСІНЫ

| Просты сказ (паміж кампанентамі словазлучэння) | | Складаназалежны сказ (паміж часткамі складанага сказа) |
|---|---|---|
| галоўны кампанент словазлучэння | носьбіт | паяснёны назоўнік у галоўнай частцы |
| атрыбутыўныя часціны мовы | атрыбут | дадзеная азначальная частка |
| віды сінтаксічнай сувязі (дапасаванне, кіраванне, прымыканне) | граматычныя сродкі выражэння | злучнікі або злучальныя словы |

Прааналізуем схему на канкрэтных прыкладах. У простым сказе Наша родная мова – гэта мова Скарыны і Буднага, Багдановіча і Купалы, Багушэвіча і Коласа... (У.Караткевіч) атрыбутыўныя адносіны выражаюцца паміж кампанентамі словазлучэнняў наша мова, родная мова, мова Скарыны і Буднага, Багдановіча і Купалы, Багушэвіча і Коласа, дзе носьбіт адносін – стрыжнёвае слова мова; атрыбут – прыналежны займеннік наша, якасны прыметнік – родная, назоўнікі ў родным склоне Скарыны, Буднага, Багдановіча, Купалы, Багушэвіча, Коласа; віды граматычнай сувязі – дапасаванне, кіраванне. У складаным сказе [1]Часамі, як кажуць, чалавек трапляе ў шчаслівы струмень, [2]што так лагодненька носіць цябе па хвалях жыцця (Я.Колас) атрыбутыўныя адносіны існуюць паміж галоўнай часткай (I) і дададзенай азначальнай (2); тут носьбіт – паяснёны назоўнік струмень у галоўнай частцы, атрыбут – дадзеная азначальная частка (які?) што так лагодненька носіць цябе па хвалях жыцця; сродак сувязі – адносны займеннік што.

Сінтаксічныя адносіны, выражаныя рознымі мадэлямі АК, даволі разнастайныя: азначальныя, азначальна-аб'ектныя, азначальна-суб'ектныя, азначальна-акалічнасныя. Кожны з гэтых тыпаў адносін мае свае семантычныя значэнні.

У азначальным тыпе выяўляюцца сінтаксічныя адносіны:

I) уласна азначальныя (родны бераг, часопіс "Полымя", сшытак у клетку, жаданне ведаць, позірк з-пад ілба);

2) абмежавальныя (кандыдат у дэпутаты, сусед па кватэры, накі-

раванне на працу, таварыш па школе, юнак душой);

3) прыналежнасць у шырокім сэнсе: а) прадмет і адушаўлёная істота, якой ён належыць (хустка маці, хвост лісы, кніга дзяўчынкі); б) частка прадмета і ўвесь прадмет (крыло самалёта, колы ад машыны, страха хаты); в) адносіны да асобы ці прадмета (знаёмы маці, брат сябра); г) адносіны да краіны, месца, калектыву, установы (грамадзянін Беларусі, дырэктар школы, жыхар вёскі, палі калгаса); д) крыніца, паходжанне асобы ці прадмета (жанчына з вёскі, святло ад лямпы, вецер з мора); е) адносіны да матэрыялу (посуд з гліны, лаўка з дубу, лекі з траў).

4) азначальна-колькасныя адносіны: а) сукупнасць прадметаў, якія лічацца (чарада птушак, зграя ваўкоў, тузін хустак, капа агуркоў; б) мера прадметаў (літр малака, метр сукна, аршын зямлі); в) змесціва прадметаў штучных і тых, што не лічацца (буханка хлеба, злітак золата, качан капусты); д) мера, ступень, мяжа праяўлення прыметы (вада да каленяў, крык на ўсю вёску, адданасць да самазабыцця);

5) выдзяляльныя адносіны (чалавек з натоўпу, кніга з паліцы);

6) адносіны якаснай характарыстыкі асобы ці прадмета (пачуццё кахання, жанчына сярэдніх гадоў, чалавек высокага росту);

7) падабенства, параўнання (валасы вянком, нос дзюбай, шапка стаўбуном, бровы дугой);

8) суправаджальнай прыметы (кватэры з выгодамі, цётка з клункам дзядзька з вусамі);

9) змесціва з тым, што яго ўтрымлівае (куфар з набыткам, гладыш з малаком);

10) сумеснасці (бацька з сынам, хлопчык з сабакам, Серафім з дзедам);

11) складу (вянок з васількоў, букет з рамонкаў, гірлянда з руж, суп з грыбоў);

12) адсутнасці ў прадмеце ці асобы чаго-небудзь (вокны без шкла, хата без коміна, стары без шапкі, неба без зорак);

13) прызначэння (лекі ад хваробы, адрэз на суkенку, ваза для кветак, надзел пад агародніну);

14) прычынна-выніковыя адносіны (смерць ад ран, забойства з-за помсты, адсутнасць з-за хваробы, апёк ад сонца);

15) мэты (урок для іншых, прыклад для пераймання).

Азначальна-аб'ектныя адносіны маюць наступныя значэнні;

1) прамога аб'екта (змена надвор'я, адмена спектакля, размяшчэнне выставы);

2) ускоснага аб'екта (дапамога сябру, абмен думкамі, любоў да кнігі, смутак па радзіме, хваляванне перад экзаменам, вера ў праўду);

3) сродку перамяшчэння (падарожжа на параходзе, вандроўка пешшу, паход на лодках);

4) мэты (праца для задавальнення, жыццё дзеля дзяцей);

5) сумеснасці і ўзаемнасці (мір паміж народамі, спрэчкі паміж сябрамі).

Азначальна-суб'ектныя адносіны больш аднародныя па сваім значэнні (усход сонца, павевы ветру, творчасць пісьменніка, абмеркаванне парламентам).

Азначальна-акалічнасны тып адносін уключае значэнні: I) азначальна-часавыя (выкананне ў тэрмін, звычка з дзяцінства, адпачынак да жніўня, сустрэчы вечарамі); 2) азначальна-прасторавыя (дарога берагам, сцяжынка праз лес, бітва на Нямізе, спуск з гары). Падставу для такой класіфікацыі атрыбутыўных адносін даюць дадатковыя семантычныя адценні, якія набывае АК у кантэксце. Безумоўна, ступень атрыбутыўнасці розных тыпаў АК не аднолькавая: яна залежыць ад віду сінтаксічнай сувязі (пры дапасаванні больш выразная, чым пры кіраванні і прымыканні).

Для рэалізацыі канкрэтных атрыбутыўных значэнняў у мове існуе шэраг розных па структуры канструкцый, якія адлюстроўваюць усё багацце ўзаемадзеяння прыметы з аб'ектам. Як вядома, словазлучэнне вызначаецца бінарнасцю саставу, пэўным відам сінтаксічнай сувязі паміж кампанентамі: парадкам размяшчэння кампанентаў. Адпаведна з гэтымі характарыстыкамі і аналізуюцца АК на ўзроўні мадэляў. У аснову класіфікацыі, як ужо адзначалася, пакладзены прынцып прыналежнасці азначэння да пэўнага класа слоў (часціны мовы), а таксама інфармацыя аб мадэлях словазлучэння: I) прыналежнасць атрыбута да канкрэтнай часціны мовы; 2) наяўнасць/адсутнасць прыназоўніка і марфалагічная форма залежнага кампанента; 3) парадак размяшчэння кампанентаў.

У раздзеле праналізаваны мадэлі АК наступных груп: "наз.$_I$+ наз.$_2$ без прыназ.", (наз.$_I$+ наз.$_2$,дапасаваны ў склоне": "наз.$_I$ + наз.$_2$ Н.", наз.$_I$+ наз.$_2$ Р.", "наз.$_I$+ наз.$_2$ Д.", "наз.$_I$+ наз.$_2$ В.", "наз.$_I$+ прыназ.+ наз.$_2$", "наз.$_I$+ прын.+ наз.$_2$ Р.", "наз.$_I$+ прын.+ наз.$_2$ В.", "наз.$_I$+ прын.+ наз.$_2$ Т."). Названыя прыназоўнікавыя і беспрыназоўнікавыя канструкцыі разглядаюцца паралельна з сінанімічнымі ім адзінкамі, у якіх залежны кампанент – прыметнік. Сінанімія АК звязана са складанымі працэсамі развіцця прыметнікаў,

дзеепрыметнікаў, прыназоўнікавай сістэмы з законамі словазлучэння.

Напрыклад, у групе "наз.$_I$+ наз.$_2$ без прыназ." найбольш прадуктыўная мадэль "наз.$_I$+ наз.$_2$ Р.". У сучаснай беларускай літаратурнай мове родны склон пераважна полісемантычны, разам з галоўным кампанентам словазлучэння ён адлюстроўвае разнастайныя адносіны паміж прадметамі і з'явамі рэчаіснасці.

На аснове аналізу АК з азначэннем, выражаным назоўнікам роднага склону, зроблены вывад, што ўсе словазлучэнні гэтага тыпу можна аднесці да адной з трох разнавіднасцей роднага склону: роднага прыналежнасці, роднага адносін або роднага якасці. Даследаванне фактычнага матэрыялу дазволіла заўважыць важную, на нашу думку, заканамернасць, якая адлюстроўвае спецыфіку названых канструкцый у сучаснай беларускай літаратурнай мове: родны склон назоўніка з адценнем якасці ўжываецца толькі з азначэннем: Гімнам вясне зазвінелі звонкія песні жаваранкаў (Я.Колас). Праз акно глядзела халоднае вока месяца (А.Жук). Ціхае шчасце сціпласці патрэбна нам для разумення свабоды паводзін (Я.Брыль). АК мадэлі "наз.$_I$+ прыназ.+ наз.$_2$" вызначаюцца у сучаснай беларускай літаратурнай мове сваёй разнастайнасцю, аднак у параўнанні з беспрыназоўнікавымі іменнымі, як паказваюць падлікі, іх менш (складаюць 21% выбаркі, што ўключае словазлучэнні з залежным кампанентам назоўнікам). Большай прадуктыўнасцю, як і ў папярэдняй групе, вызначаецца мадэль з родным склонам залежнага кампанента, што тлумачыцца багаццем прыназоўнікаў і семантычных адценняў. Прааналізавана структура і семантыка наступных канструкцый: "наз.$_I$+ ад + наз.$_2$ Р." (пакет ад цукру, пачак ад запалак); "наз$_I$+ з-пад + наз$_2$ Р." (бляшанка з-пад манпасье, шклянка з-пад малака); "наз.$_I$+ з + наз.$_2$ Р." (падсвечнік з бронзы, посуд з гліны, шторы з ільну, хлапчукі з вёскі, турысты з Беларусі); "наз.$_I$+ для + наз.$_2$ Р." (тэатр для дзяцей, прылады для пісьма, месца для адпачынку);"наз$_I$+ да + наз.$_2$ Р." (шлях да горада, білет да Мінска, адпачынак да восені, размова да світання, любоў да Айчыны, павага да настаўніка); "наз.$_I$+ без + наз.$_2$ Р." (вокны без шкла, вёска без людзей, позірк без маны).

Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнымі часткамі разглядаюцца ў сістэме складаных сказаў з боку іх структуры, сродкаў сувязі, сэнсавых адценняў даданых частак, што дазваляе гаварыць аб наяўнасці атрыбутыўных адносін у межах складанага сказа. Даданыя азначальныя сказы паясняюць назоўнікі ў галоўным сказе і, за-

мяняючы прыметнік, выконваюць функцыю атрыбута: Пад тупат і гоман, што усё мацнелі, множыліся, весялей было ўпраўляцца са сваім клопатам (І.Мележ) і Пад моцны тупат і гоман весялей было ўпраўляцца са сваім клопатам.

Дадания азначальныя часткі могуць уступаць у сінанімічныя адносіны паміж сабой, маючы пры гэтым розную ступень атрыбутыўнасці, а таксама дадана азначальная частка можа быць сінанімічнай дзеепрыметным зваротам, дзеепрыметнікам, прыметнікам.

Істотнай прыметай атрыбутыўнасці з'яўляецца указальны займеннік той у галоўнай частцы і злучнік які, бо наяўнасць указальнага займенніка пры назоўніку патрабуе абавязковага азначэння: Яна (Маня) надала свайму твару тую лінію, той выраз, які люстэрка паказвала ёй (Я.Колас). Чалавек павінен падарожнічаць, ведаць тую зямлю, на якой нарадзіўся... Я.Сіпакоў).

Прааналізаваны матэрыял дае падставу сцвярджаць, што наяўнасць азначальных частак, звязаных з галоўнымі рознымі злучнікамі, якія маюць аднолькавае функцыянальнае значэнне, дазваляе пазбегнуць паўтарэння адных і тых жа сродкаў сувязі, стварае ўмовы для рэалізацыі сінанімічных канструкцый. Важную ролю адыгрывае сінаніміка сродкаў у складаных сказах, што ўключаюць разнастайныя дададзеныя. Выбар пэўных сродкаў сувязі ў складаным сказе залежыць ад лексічнага значэння назоўніка, які паясняе дадзены сказ, спосабу якаснай характарыстыкі, у некаторых выпадках – абумоўлена стылем.

У трэцяй главе "АК як спецыфічны сродак дыферэнцыяцыі функцыянальных стыляў мовы" атрыбутыўнае словазлучэнне разглядаецца не толькі як адзінка, што вылучаецца са сказа і функцыянуе ў сказе, але і як структурны элемент пэўнага тэксту (мастацкага, публіцыстычнага, навуковага).

Так, у мастацкіх тэкстах даволі пашыраная мадэль ПН ("прым.+ наз."). Вобразнасць, уласцівая тэкстам мастацкай літаратуры, у пэўнай ступені абумоўлена спалучальнасцю кампанентаў словазлучэння, адзін з якіх можа ўжывацца ў пераносным значэнні і надаваць метафарычнасць другому. Функцыю такога кампанента ў словазлучэннях мадэлі ПН выконвае прыметнік, які, з'яўляючыся вобразным азначэннем (эпітэтам), здольны метафарызаваць мікракантэкст (словазлучэнне). Прыметнік сіні ў АК звычайна спалучаецца з назоўнікамі хвалі, неба, акіян, вада, вочы. Сіні колер уласцівы таксама назоўнікам, якія абазначаюць час сутак перад наступленнем ночы: сіні вечар, сіняя ноч, сіні прыцемак. Словазлучэнні сіні смутак, сіняя музыка, сіняя цішыня нават у мікракантэксце вызначаюцца экспрэсіў-

насцю. Назіранне над функцыянаваннем атрыбутыўнага словазлучэння мадэлі ПН з атрыбутам сіні у апавяданні В.Карамазава "Сінія ночы, агністыя бліскавіцы" паказалі, што аўтар ужывае 23 канструкцыі з прыметнікам сіні. Частае ўжыванне словазлучэнняў такога тыпу стварае пэўны эмацыянальны настрой, выразную гаму колераў, дае псіхалагічную ацэнку мастацкага вобраза.

Атрыбутыўныя адносіны ў мастацкім стылі выражаюцца рознымі мадэлямі, якія не аднолькавыя па сваёй прадуктыўнасці. Напрыклад, у сказах Палёўка пры лесе – Узбор'е. Вёска – сорак двароў, на захад – жытное горнае, на ўсход – перазовы бароў (В.Зуёнак) ёсць наступныя мадэлі: НН, НС, НП, НН.

Прадуктыўная ў мастацкай прозе мадэль ППН: "прым.$_{1}$+ прым.$_{2}$+ наз." У цудоўнай ліпеньскай красе – зялёная мірная зямля (І.Мележ). Як правіла, у такіх словазлучэннях адзін прыметнік адносны, другі якасны. Больш дакладна ў сэнсавых адносінах характарызуе прадмет азначэнне, што стаіць бліжэй да паяснёнага назоўніка. Яно звычайна выражаецца адносным прыметнікам; азначэнне, выражанае якасным прыметнікам, мае адценне экспрэсіўнасці.

Адной са спецыфічных рыс публіцыстычных тэкстаў з'яўляецца развітае недапасаванае азначэнне ў складзе канструкцый, уласцівых кніжным стылям. Найбольш высокая іх частотнасць у навуковым і публіцыстычным стылях (адпаведна I6% і I4,7%).

Мадэль НН у публіцыстычным стылі ўключае наступныя групы словазлучэнняў: "наз.+ нескалан.абрэвіятура" (краіны СНД, прадстаўнікі МУС, эксперты МВФ); "наз.+ знак метамовы" (статус кво, рубрыка "36,6"); наз.+ лічэбнік у наз.склоне" (дні музыкі-92, "Весялоўка-93").

Акрамя названых канструкцый, спецыфічных публіцыстычнаму стылю, пашыранай з'яўляецца мадэль ПН, бо часта менавіта ў атрыбутыўным словазлучэнні сціраецца ранейшае значэнне слова і нараджаецца новае, грамадска-публіцыстычнага характару. Так узнікаюць своеасаблівыя неалагізмы, утвораныя шляхам абстрагавання першапачатковага значэння гэтага слова і напаўнення яго новым сацыяльна-палітычным зместам. Такія словазлучэнні з часам становяцца тэрміналагізаванымі (працоўнае пытанне, сялянскае пытанне і інш).

Частае ўжыванне АК у навуковым стылі тлумачыцца, у першую чаргу, намінатыўнасцю стылю, які адлюстроўвае паняційны, паслядоўна лагічны характар навуковага мыслення. Асноўная семантычная асаблівасць АК у навуковым стылі заключаецца ў канкрэтным значэнні характарыстыкі прадметаў па іх прызначэнню (вуглездабываючая пра-

мысловасць, нафтаперапрацоўчы завод, пад'ёмны кран).

Найбольш прадуктыўнымі ў навуковым стылі з'яўляюцца азначэнні, выражаныя прыметнікам, які ўваходзіць не толькі ў склад свабодных словазлучэнняў, але і тэрмінаў: Росту і захаванню каляндарнага фальклору на Беларусі ў сярэдневяковы перыяд і пазней садзейнічалі гістарычныя ўмовы, у цэлым не спрыяльныя для культурнага развіцця беларускага народа (Паэзія беларускага земляробчага календара).

Радзей у навуковым стылі выкарыстоўваюцца АК, азначэнне ў якіх выражана займеннікам, парадкавым лічэбнікам, што садзейнічае спрашчэнню і лакалізацыі выказвання.

Канструкцыі з займеннікам (ЗН – 8%) у мастацкай прозе і паэзіі сустракаюцца часцей, чым у тэкстах навуковага стылю (ЗН – 4,8%). Значыць, функцыянальныя стылі мовы адрозніваюцца адзін ад аднаго перш за ўсё верагоднасцямі (ступенню гатоўнасці да камунікатыўнага прымянення) моўных адзінак, а наборы гэтых верагоднасцей характарызуюць стылі.

## ВЫВАДЫ

Як паказала праведзенае даследаванне, АК – гэта не эклектычна собраныя рознаўзроўневыя паняцці, а комплекс узаемазвязаных кампанентаў, своеасаблівая сістэма, элементы якой знаходзяцца ў пэўных узаемаадносінах і надаюць новую якасць цэламу.

Найбольшай прадуктыўнасцю ў сучаснай беларускай літаратурнай мове (38% выбаркі) вызначаюцца канструкцыі групы "наз.$_I$+ наз.$_2$ Р.", якія характарызуюцца багаццем семантыка-сінтаксічных адценняў і абазначаюць прыналежнасць асобе (світка селяніна, хата лесніка, доля сіраты, кватэра суседа); прыналежнасць неадушаўлёным прадметам (ліст клёна, промні сонца, сцены школы); прыналежнасць да месца, калектыву, установы (зямля Беларусі, балоты Палесся, вуліцы горада, жыхары лесу, студэнты універсітэта); раскрываюць змест пэўнага паняцця (кодэкс маралі, ідэалогія хрысціянства, сродкі мовы); значэнне носьбіта прыметы (святло месяца, зорка шчасця, пах флёксаў, кусты бэзу); складаныя словазлучэнні, залежны кампанент якіх абазначае ўзрост або якасную характарыстыку прадмета ці асобы (хлопчык гадоў чатырох, чалавек высокага росту, восень мінулага года).

Аналіз АК пацвярджае гіпотэзу, што значэнне слова трэба прызнаць адным з вырашальных фактараў, якія ўплываюць на сінтаксіч-

ную валентнасць. Так, для выражэння прасторавага значэння у АК ролю стрыжнёвага слова выконваюць назоўнікі з прасторавым значэннем <u>дарога</u>, <u>шлях</u>, <u>сцежка</u>, <u>накірунак</u> (дарога да лесу, шлях да зор, сцежка да хаты, кірунак да горада).

Сінонімы да кожнай з груп словазлучэнняў разглядаюцца ў дысертацыі не толькі як важны стылістычны сродак, але і як сродак дыферэнцыяцыі сінтаксічных адносін, адзін з крытэрыяў адмежавання АК ад іншых, бо ступень атрыбутыўнасці розных мадэляў не аднолькавая.

Межы сінаніміі пашыраюцца на сказ і словазлучэнне, што сведчыць пра багатыя стылістычныя магчымасці канструкцый з атрыбутыўнымі адносінамі.

Колькасныя і якасныя асаблівасці АК паказваюць, што для кожнага стылю мовы побач з агульнамоўнымі сродкамі арганізацыі сінтаксічнага плана выражэння існуюць і спецыфічныя сродкі, уласцівыя толькі дадзенаму канкрэтнаму стылю, і таму вызначаюць яго спецыфіку. Да такіх спецыфічных сродкаў адносяцца АК.

Асноўны змест дысертацыі адлюстраваны ў публікацыях:

I. Катэгорыя атрыбутыўнасці і сродкі яе выражэння // Роднае слова. - 1994, №2. - С.25-30.

2. Атрыбутыўная канструкцыя як спецыфічны сродак дыферэнцыяцыі функцыянальных стыляў мовы // Удасканаленне прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў сучаснай сістэме адукацыі: Зборнік навуковых артыкулаў. - Мінск, 1994. - С.36-41.

3. Сістэма атрыбутыўных словазлучэнняў беларускай мовы // Матэрыялы Трэцяй Міжнароднай навуковай канферэнцыі. - Віцебск, 1994. - С.29-32.

Рэзюме

Бондал Ірына Васілеўна
"Канструкцыі з атрыбутыўнымі адносінамі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове"
(структурна-семантычная характарыстыка)

Ключавыя словы: катэгорыя атрыбутыўнасці, атрыбутыўная канструкцыя (АК), залежнае слова, стрыжнёвае слова, валентнасць, семантыка, сінтаксічныя сінонімы, стыль мовы.

Аб'ект даследавання – канструкцыі з атрыбутыўнымі адносінамі ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Мэта даследавання – даць найбольш поўнае структурна-семантычнае апісанне сістэмы атрыбутыўных канструкцый, якая рэалізуецца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове праз субстантыўныя і ўласна атрыбутыўныя, прыназоўнікавыя і беспрыназоўнікавыя словазлучэнні ў простым і складаным сказе.

Апісанне і аналіз АК з іх сінанімічнымі эквівалентамі праведзены ў рамках словазлучэння і сказа. Статыстычны аналіз дае падставы разглядаць АК як спецыфічны сродак дыферэнцыяцыі моўных стыляў.

Для дасягнення пастаўленай мэты і вырашэння канкрэтных задач былі выкарыстаны метады структурна-семантычнага аналізу, лінгвістычнага апісання моўных фактаў з выкарыстаннем кампанентнага аналізу.

Вынікі даследавання непасрэдна звязаныя з устанаўленнем правіл і прыёмаў размежавання сінтаксічных адносін у практыцы выкладання беларускай мовы ў школах і ВНУ рэспублікі. Матэрыял дысертацыі можа быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для філолагаў, а таксама для асобнага спецкурса, бо дае магчымасць разглядаць атрыбутыўныя адносіны комплексна, уключаючы пэўныя тэмы з раздзелаў "Лексіка", "Марфалогія", "Сінтаксіс". Выдзяленне тыпаў атрыбутыўных канструкцый дапаможа больш глыбока зразумець сінтаксічную катэгорыю азначэння.

Резюме

Бондал Ирина Васильевна

"Конструкции с атрибутивными отношениями в современном белорусском литературном языке" (структурно-семантическая характеристика)

Ключевые слова: категория атрибутивности, атрибутивная конструкция (АК), синтаксические отношения, зависимое слово, главное слово, валентность, семантика, синтаксические синонимы, стиль языка.

Обьект исследования – конструкции с атрибутивными отношениями в современном белорусском литературном языке.

Цель исследования – дать наиболее полное структурно-семантическое описание системы атрибутивных конструкций, которая реализуется в современном белорусском литературном языке с помощью субстантивных и собственно атрибутивных, предложных и беспредложных словосочетаний в простом и сложном предложении.

Описание и анализ АК и их синонимических эквивалентов проведены в рамках словосочетания и предложения. Статистический анализ дает основания рассматривать АК как специфическое средство дифференциации языковых стилей.

Для достижения поставленной цели и решения конкретных задач были использованы методы структурно-семантического анализа, лингвистического описания языковых фактов с использованием компонентного анализа.

Итоги исследования непосредственно связаны с установлением правил и приёмов разграничения синтаксических отношений в практике преподавания белорусского языка в школах и вузах республики. Материал диссертации может быть использован при подготовке учебников и учебных пособий для филологов, а также для отдельного спецкурса, так как дает возможность рассматривать атрибутивные отношения комплексно, включая определенные темы разделов "Лексика", "Морфология", "Синтаксис". Выделение типов атрибутивных конструкций поможет более глубоко понять синтаксическую категорию определения.

## SUMMARY

Bondal Irina Vasilyevna

"Constructions with attributive relations in modern Belarussian literaty language" (structural and semantic description)

Key words: category of attributiveness, an attributive construction (AC), sintactical relations, a model, a component, a derendent word, the main word, valency, semantics, syntactical synonyms, style of language.

The object of research are construction with attributive relations in modern Belarussian literary language.

The purpose of the research is to give the fullest possible structural and semantic description of the system of attributive constructions which is realized in modern Belarussian literary language by means of substantive and attributive proper, prepositional and non-prepositional combinations of words in the simple and the complex sentence. Description and analysis of ACs and their synonymic equivalents have been carried out within the framework of a word combination and a sentence. The statistical analysis gives good grounds for regardind an AC as a specific means of differentiation of language styles.

In order to arcieve the purpose and to solve the concrete tasks of the research the following methods have been used: the method of structural-semantic analysis, the method of linguistics discription of language facts making also use of the componet analysis.

The results of the research are directly connected with the establishment of rules and methods of differentiation between syntactical relations in the practice of teaching Belarussian at schools and higher educational institutions of the republic. The material of the thesis may be used when preparing manuals and textbooks for philology students as well as for a special study course since it enables one to regard attributive relations as a complex including some themes from "Lexicology", "Morphology", "Syntax". The determination of the types of attributive constructions will enable one to understand the syntactic category of attribute more profoundly.